# Вышыня Рыгора Дзенісенкі

**Вокны гэтай кватэры выходзяць на адну з самых працяглых і прыгожых вуліц Гомеля - Савецкут. І кожны раз, прыходзячы пауз дом, якім жыў Герой Савецкага Союза Рыгор Кірылавіч Дзенісенка, адчуваў гонар, што ёсць V пашой Беларусілюдзі гэтак моцныя духам, адданыя Радзіме. З імі і сам адчуваеш сябе надзейна, упэўнена.**

**Але чалавека-легенды няма з намі. Балючая праўда. Ад якой нікуды не дзенешся. Толькі ў памяці засталіся ўспаміны аб некалькіх сустрзчах з ветэранам Вялікай Айчыннай, настаўнікам маладых, грамадскім дзеячам, ветэранскім актывістам.**

**Я с крива намятаю наша першае знаёмства. Яно было на Палессі.**

**Кіраўнікі ветэранскіх аргїнізацый Гомельшчыны вывучалі вопыт мясцовых налег па захаванню гістарычнай памяці аб трагічных і легендарных старонках вайны, не-пасрэднай рабоце па сацыяльнай абароне тых, хто праліваў кроў за права на існаванне нашай Айчыны. Менавіта тады адзін са знаёмых ветзранаў, Адам Піліпавіч Аліфяровіч, падвёў мяне да статнага хударлявага мужчыны, які стаяў ля аўтобусаразам з ветэранскімі актывістамі. Прадставіў яго Аліфяровіч коротка: «Гэта, Валодзя, незвычайны чалавек. Дзенісенка Рыгор Кірылавіч. Лётчык. Герой Савецкага Саюза...» А «незвычайны чалавек» усміхнуўся мне, «унуку ветзрана» (такмяне прадстйвіў Аліфяровіч), і моцна паціснуў руку. 1 хоць наша сустрэча і гутарка былі кароткімі - шмат было сустрэчу ветэранаў на працягу дня - запомніліся яго шчырасць, неверагодная прастата, натуральнасць ска занага.**

**Тое першае шапашнае знаёмства запала ў памяць надоўга. Нешта і напісалася тады пра тую сустрэчу...**

**А нядаўна, гады два тому, у маі, выпадкова сутыкнуліся ў цэнтры Гомеля. Рыгор Кірылавіч вяртаўся з ранішняга променаду. Я быў проста ашаломлены: 87-гадовы лётчык Дзенісенка штораніцы праходзщь бадзёрым кронам па 10-12 кіламетраў, з ранняй вясны да глыбокай восені купаецца ў Сажы, пакуль вада не астыне хаця б да васьмі градусаў - і навит не збіраецца пакідаць свае заняткі! Вось - зайздросная сіла волі!**

**Рыгор Кірылавіч з задавальнен-нем згадаў нашу першую сустрэчу. Я нават здзівіўся: памятае тое кароткае знаёмства. І, так сталася, папрасіў дазволу напісаць нарыс пра яго да свята вызвалення Беларусі. «Ды пра мяне ўжо столькі пісалі...» - нібыта просячы прабачзння, усміхнуўся былы лётчык, падпалкоўніку адстаўцы. «Што ж, калі ёсць жаданне, -пішыце'...»**

**Так з'явіўся гэты матэрыял, які паспеў прачытаць Рыгор Кірылавіч v першапачатковым варыянце. Іпеяк сарамліва сказаў: «Добра папрацавалі, галоўныямо-манты майго жыцця “схоплены”. Друкуйце, калі ласка»...**

**Нядаўна споўнілася толькі паўгода, як РыгораДзенісенкі няма з намі. Пройдземся ж жыццёвымі пуцявінамі гэтага выдатнага чалавека. Няхай гзты артыкул стане асаблівай данінай павагі.**

## ДА АТЛАНТАУ, ЯКІЯ ТРЫМАЮЦЬ НЯБЁСЫ

Рыгорка Дзенісенка быў у чацвёртым класе, калі Мікалай Пятровіч Каманін здзейсніў свой подзвіг. І ў яго дзіцячым усведамленні Герой Савецкага Саюза асацыяваўся з чалавекам-глыбай, гэтакім Атлантам, які трымае неба. Калі чалюскінцы здзяйснялі вгаяж па краіне і праязджалі найблізкую чыгуначную станцыю Славянск у Данбасе, хлапчукі на дрэвы забраліся, каб іх убачыць. Каманін - старшы лейтэнант - паўстаў тады на пероне маленькім, худзенькім чалавекам... Хіба Рыгор Дзенісенка мог тады падумаць, што праз гады будзе пастаянна сустракацца з Мікалаем Пятровічам і ён будзе яго настаўнікам?

У Ізюмскім раёне Харкаўскай вобласці ёсць вёсачка Бабенкава. Тэта

малая радзіма Дзенісенкі, яго карані...

Цяпер там ужо нікога з родных няма. Сястра жыве ў сяле Чырвоны Аскол, дзе хлопец закончваў сёмы клас...

Бацьку да 1937 года кідалі з аднаго раёна ў іншы - на ўмацаванне мясцовых гаспадарак. Так сям'я апынулася ў Данецкай вобласці, а Рыгор Дзенісенка у 9-м класе Хрэстышчанскай сярздняй школы Славянскага раёна. Здавалася б, куды там марыць пра нябё-сы, калі бацькі - патомныя ся-ляне і клапоцяцца пра зямлю-маці? Толькі ж тады не было больший мары, як пакарыць неба. Вясковыя хлапчукі тады трызнілі ім. I калі ў школе з'явіўся інструктар аэраклуба, усе кінуліся запісвацца ў «пілоты». Разам з сябрамі Рыгор Дзенісенка пачынаў шлях у авіяцыю з аэраклуба ў горадзе Сла-вянску. Жаданне лятаць, пакарыць неба зацямніла ўсё астатняе, бо, як спяваецца ў некалі папулярнай песні: «Перш за ўсё, перш за ўсё -самалёты. Ну а дзяўчыны? А дзяўчыны потым». У 1940 го-дзе, адгукнуўшыся на заклік камсамола «Дадзім краіне 100 тысяч лётчыкаў!», юнак паступіў у Луганскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча, вучо-бу ў якім завяршыў у тыла-вым уральскім горадзе.

Маладосць выпрабава-ла яго на трываласць ужо ў навальнічным небе вайны...

**«ПРЫВІТАННЕ, "ПАВЕТРАНАЯ ПЯХОТА"»!**

У 1943 годзе Дзенісенка скончыў ваенна-авіяцыйную школу. У Паўночным Казахстане, ва Уральску, маладыя лётчыкі адпрацоўвалі тэхніку пілагавання без бая-вога прымянення. Неўзабаве Дзенісенку даверылі штурмавік ІЛ-2 і накіравалі

ў першы асобны вучэбны авіяцыйна-трэніровачны полк у горадзе Сасова Разанскай вобласці. 3 ліпеня па кастрычнік там ён праходзіў падрыхтоўку: вучыўся страляць па мішэнях, лятаць строем. Потым накіравалі пад Кіеў, у раён Броварах. Праз месяц адбылося яго «баявое хрышчэнне» лётчыка-штурмавіка: 3 лістапада быў яго першы баявы вылет на прыгарад Кіева. Там ішлі моцныя баі...

Штурмавікоў звалі «паветранай пяхотай», бо яны, як і пяхотнікі на полі бою, неслі самыя вялікія страты сярод лётчыкаў. Лялалі на вельмі нізкіх вышынях. Нашы



самалёты можна было збіць нават з пісталета, - распавёў Рыгор Кірылавіч. - I усё ж ваявалі! Думаеце, чаму? До-брыя людзі былі побач і шмат чаму вучылі!

Шчаслівым выпадкам лётчык-герой назаве праз гады тое, што ў лістападзе 1943 года ён быў размеркаваны ў 235-ы штурмавы авіяцыйны полк 5-га шгурмавога авіяцыйнага корпуса, якім камандаваў той самы Мікалай Пятровіч Каманін, слаўны Герой Савецкага Саюза! А яшчэ цудоўны чалавек - камандзір яго эскадрыллі, беларус, выхадзец з вёскі Міхайлаўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці Пётр Рыгоравіч Дылько, які перад першым баявым вылетам падзяліўся з хлопцам уласнай формулай выжывання ў небе: «Не напрошвайся, не адмаўляйся і выконвай усё, што табе скажуць».

Нажаль, формула не вы-ратавала самога камандзіра. Пётр Дылько не вярнуўся з задания...

... Дылько збілі пры пошуку стаўкі Гітлера ў наваколлях Вінніцы. Толькі праз 25 гадоў Рыгор Дзенісенка знайшоў яго магілу, зрабіў усё магчымае для годнага ўвекавечання памяці чалавека, у якога вучыўся ваяваць.

Першую ўзнагароду - ордэн Славы трэцяй ступені - Рыгор Кірылавіч Дзенісенка атрымаў 22 лістапада 1943

года.

У Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, якую называлі «малы Сталінград», малады лётчык паспяхова выканаў загад знішчаць транспаргныя самалёты суперніка, якія дастаўлялі заціснутым пад-войным кольцам дывізіям баепрыпасы і харч. На яго рахунку было 12 збітых самалётаў. За гэтыя бітвы ў небе Дзенісенку прадставілі да ордэна Чырвонага Сцяга.

...Гітлераўцы шэсць разоў збівалі ў баі самалёт ІЛ-2, якім кіраваў Дзенісенка, двойчы яму прыходзілася скакаць з парашутам з ахопленай полымем маіныны, але ўсё абыходзілася пілот застаўся жывы і працягваў ваяваць.

У добрых настаўнікаў з'явіўся добры вучань. Ды яшчэ які! За паўтара гады ён здзейсніў 197 вылетаў, знішчыў на зямлі 20 варожых самалётаў, 47 танкаў, велізарную колькасць іншай тэхнікі, тры чыгуначных эшалоны. Якія ж каласальныя страты вырабіў вермахту ўсяго адзін савецкі лётчык-ас!

Толькі двое лётчыкаў за-сталося з палка - ён і Рашыд Нігматулавіч Хайрадзінаў ва Уфе. Дзенісенка да апошніх сваіх дзён вёў з ім гіерапіску...

### «ЁН ЗАЎСЁДЫ НАПЕРАДЗЕ...»

Пачаўшы баявыя дзеянні радавым лётчыкам, Дзенісенка неўзабаве вырас да штурмана эскадрыллі 235-га штурмавога авіяцыйнага Праскураўскага палка 5-й паветранай арміі. Ужо праз два месяцы пас-ля першых баявых вылетаў малодшы лейтэнант быў узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, а ў 1944 годзе да гэтай узнагароды дадалося яшчэ два ордэны Чырвонага Сцяга.

Ва ўзнагародным лісце камандзір палка так ахарактарызаваў маладога афіцэра: «Падчас баёў набыў бататы баявы вопыт, у дасканаласці авалодаў тэхнікай пілатавання. Мужны лётчык-штурмавік адважна знішчае баявую тэхніку, вузлы супраціўлення і жывую сілу суперніка. Яго прыцэл дакладны, а адвага і смеласць не ведаюць межаў. Як штурман эскадрыллі ён заўсёды наперадзе, у найскладаных метэаўмовах выдатна выконвае самыя адказныя заданні...»

У снежні 1943 года лейтэ-іант Дзенісенка атрымаў загад: знішчыць варожыя танкі і аўтамашыны ў раёне Радомышля. На штурмоўку варожай тэхнікі выляцелі шэсць Ілаў у суправаджэнні трох знішчальнікаў. Пры падыходзе да мэты савецкіх штурмавікоў паспрабавала атакаваць трупа «мессершміттаў». Агнём паветраных стралкоў і нашых знішчальнікаў варожыя напады былі адбітыя. «Илюшины» настойліва працягвалі ісці наперад па зададзеным курсе. А праз некалькі хвілін лётчыкі выявілі ў лагчыне вялікую колькасць танкаў і пяхоты суперніка. І тут жа па нашых самалётах ударылі варожыя зяніткі. Нягледзячы на моцны загараджальны агонь, трупа Ілаў штурмана Дзенісенкі, умела манеўруючы, прабілася да мэты і абрынула на ворага ўвесь свой бомбавы груз. А затым, пікіруючы адзін за другім, савецкія штурмавікі адкрылі шквальны агонь з гармат і кулямётаў. У выніку двух праведзеных нападаў яны знішчылі 5 танкаў, 15 аўтамашын і да 70 гітлераўскіх салдатаў і афіцэраў.

Пасля выхаду з атакі на самалёт лейтэнанта Дзенісенкі напалі два «мессершмітты», якія па чарзе пачалі заходзіць да яго зверху, злева і з хваста.

Мужны лётчык, павярнуўшы машыну, даў магчымасць свайму паветранаму стралку весці прыцэльны агонь па сцярвятніках. З другой чаргі «мессершмітт» задыміў і пайшоў да зямлі. Аднак на дапамогу пакінутаму падаспеў яшчэ адзін нямецкі ас. З падвоенай лютасцю яны накінуліся на самалёт Дзенісенкі, абстрэльваючы яго кулямётным агнём. Машына атрымала цяжкія пашкоджанні. Але адважны лётчык выйшаў з бою пераможцам. Рызыкуючы жыццём, ён прывёў знявеча-ную машыну ў размяшчэнне свайго аэрадрома...

Выдатна валодаючы тэхнікай пілатавання, Рыгор Кірылавіч лятаў на баявыя заданні пры любых пагодных умовах. Аднойчы ў лютым 1944 года штурмана Дзенісенку тэрмінова выклікалі ў штаб палка. Кароткі дзень быў ужо на зыходзе, зрэдку ішоў невялікі снег. Увайшоўшы ў памяшканне штаба, афіцэр далажыў аб сваім прыбыцці. Камандзір палка адарваўся ад карты і падышоў да Дзенісенкі.

- Ёсць загад, лейтэнант, падтрымаць пяхоту з паветра. Узляціш?

- Так точна, таварыш маёр!

А праз чвэрць гадзіны малады лётчык на сваім грозным Іле ў пары са знішчальнікам падняўся ў паветра. Нягледзячы на кепскую бачнасць, яны дакладна ў час выйшлі на мэту, выявіўшы ў раёне сяла Пошуўка шмат нямецкіх танкаў. Штурмавік пад агнём зенітнай артылерыі здзейсніў 4 атакі. Бомбы і снарады яго леглі ў «цэль». Дзенісенка знішчыў 6 танкаў і да 30 ва-рожых салдатаў і афіцэраў. Але пры штурмоўцы самалёт атрымаў моцныя пашкоджанні. На корпусе штурмавіка заста-лося да 60 прабоін: пабітая прыборная дошка, збіты правы элерон, пашкоджаныя плоскасці і паветрасістэмы. Кіраваць машынай было цяж-ка, але высокае майстэрства дазволіла адважнаму лётчыку дацягнуць да свайго аэрадрома і ажыццявіць пасадку.

Вызначыўся Рыгор Дзенісенка і ў жніўні пры знішчэнні акружанай варожай групіроўкі ў раёне вёскі Белы Камень. На тэты раз на штурмоўку варожых пазіцый ён вёў трупу з дваццаці чатырох Ілаў. На падыходзе да мэты нашых штурмавікоў лютым агнём сустрэла зянітная арты-лерыя немцаў. Усё неба пачар-нела ад узрываў снарадаў. Але Дзенісенка са сваёй групай адважна рынуўся ў атаку. На варожую тэхніку паляцелі бомбы, рэактыўныя снарады, ударылі гарматы і кулямёты. Запалалі танкі, аўтамашыны, забегалі ў паніцы фашысты, а штурмавікі на чале з лейтэ-нангам Дзенісенка працягвалі наносіць свае магутныя ўдары...

Усяго за васемнаццаць месяцаў вайны мужны лётчык Рыгор Дзенісенка здзейсніў 197 баявых вылетаў. Ён удзельнічаў у 26 паветраных баях, у якіх збіў два варожых знішчальнікі і адзін транспартны самалёт. На зямлі ім знішчана 20 самалётаў ворага, 47 танкаў, 122 аўтамашыны, 3 чыгуначныя эшалоны, 4 артылерыйскія батарэі, 13 мінамётаў, 8 складоў з гаручым і баепрыпасамі, каля 600 варожых салдатаў і афіцэраў.



Р. К. Дзенісенка разам з ветэранскімі актывістамі М. В. Ігнаценка і П. А. Шаўцовай

За праяўленую доблесць, геройства і майстэрства ў баях за Радзіму Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 мая 1946 года Рыгору Дзенісенку прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

**ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА**

2 мая, падпісанне Германіяй капітуляцыі, я сустрэў у мястэчку Сенніца, у Чэхаславакіі,- успамінаў Рыгор Кірылавіч. -

А раніцай на задание трэба ляцець. Дзень, два, тры лятаем. Дзявятага мая аб'яўляюць афіцыйна аб завяршэнні вайны. Усё, што магло на той момант страляць, страляла безупынна. А 10 мая зноў на задание трэба ляцець. На наступим дзень - таксама. Неабходна было дабіць варожую групоўку Шэрнер у Чэхаславакіі. Байна там ЯІНЧЭ ішла ў чэрвені і ліпені. У нашым палку два Сяргеі - Драніцын і Г рышаеў загінулі. Першы - 24 красавіка, другі 27 красавіка 1945-га. Боль страты неймаверны. Грышаева я хацеў ажаніць на сваёй малодшай сястрыцы, мы былі вялікімі сябрукамі... Цяпер у мяне ўнук Сярожа і праўнук Сярожа.

Першапачаткова Парад Перамогі планаваўся на 12 чэрвеня 1945-га, а метэаслужба паведаміла аб дрэнным надвор'і. Перанеслі на 24 чэрвеня, але ў тэты дзень імжэў дожджык. Авіяцыя не лятала, так што па шляху следавання наш батальён лётчыкаў уліўся ў грамадзянскія калоны. Мора радасных людзей. Рэдкія парасоны над імі, у асноўным усе накрываліся цыратай. Гарманісты быццам спаборнічаюць паміж сабою, хто каго перайграе. Паўсюль гучаць тосты за Перамогу, падкідваюць уверх пераможцаў з воклічамі «ура!» Адчуванне вялізнага свята, радасць бязмежная.

Пасля гэтага незабыўнага параду быў адпачынак дома. Потым Рыгору прыйшлося зноў вярнуцца ў Чэхаславакію. Толькі ў жніўні іх вывялі ў Саюз. Самалёты гіасадзілі ў мя-стэчку Таруціна, вядомым тым, што вялікі Сувораў рыхтаваў там наступ на крэпасць Ізмаіл. А Дзенісенка тут

ажаніўся, тут і першынец, сын Валодзя, з'явіўся на свет...

Звыш 30 гадоў працуе ў «Палесдруку» мой сын, - дзяліўся ўласным Рыгор Кірылавіч. - З Лідзіяй Іванаўнай у нас было каханне з першага погляду. Добрая была жанчына. Выдатная маці. Мы пражылі разам амаль 55 гадоў, выхавалі дваіх дзяцей. Наша Наталля з сям'ёй жыве ў Луганску. А Лідзіі ўжо шмат гадоў як няма...

...Баявы лётчык, Герой Савецкага Саюза Рыгор Дзенісенка ўпершыню прымаў удзел у пераможным парадзе перад Маўзалеем у 1945-м.

У наступим раз, толькі праз 40 гадоў, - ужо ў калоне ветэранаў. З тых часоў Рыгор Кірылавіч да драбнюткіх падрабязнасцяў памятае ўсе шэсць маскоўскіх парадаў, у якіх удзельнічаў. Казаў, што да 2000 года ветэраны ў Дзень Перамогі маршыравалі па Чырвонай плошчы нароўні са страявымі часцямі, гэтак жа цягнулі «насок» і трымалі тэмп. І толькі ў мінулы раз ім закамандавалі «вольна»...

- Ды дзе там вольным крокам пойдзеш, калі аркестр іграе! - казаў Дзенісенка. Так і крочылі.

У 2005-м разам ветэраны праехалі па Чырвонай плошчы ў аўтамабілях, стылізаваных пад франтавыя паўтаратонкі. Рыгор Кірылавіч лічыў, што задумка гэтая, вядома, прыгожая і мэтазгодная, але сам ён аддаваў перавагу пешаму ладу.

**НАСТАЎНІК ПЕРШАГА КАСМАНАЎТА**

Пасля вайны нават Героі Савецкага Саюза месца працы не выбіралі. Куды радзіма пашле. Спачатку Дзенісенка апынуўся ў Курску. У мясцовым аэраклубе франтавік працаваў на працягу пяці гадоў, першы час - начальнікам лётнай часткі, затым - начальнікам клуба. Па лініі ДТСААФ былыя лётчыкі рыхтавалі для Узброеных Сіл парашутыстаў, навучалі лётчыкаў-спартсменаў. Пасля пераможнага завяршэння вайны з Германіяй імкненне рабят патрапіць на ваенную службу было выключным.

Рыгор Кірылавіч ездзіў у раёны - там займаўся з юнакамі прызыўнога ўзросту тэорыяй, а практыкаваліся яны ў Курску. Навучаючы маладых, ён таксама прыгаў з парашутам, здзейсніў 550 прыжкоў, асвоіў ўсе гыпы вучэбных самалётаў.

Пасля лёс накіраваў яго ў саратаўскі аэраклуб сістэмы ДТСААФ. Гэта быў 1954 год. Курсанты ваенныя лётчыкі ішлі потым у ваенныя вучылішчы або грамадзянскую авіяцыю. Юрый Гага-рын - ад прыроды таленавіты хлопец, адрозніваўся сваёй настойлівасцю. Ён жыў грамадскім жыццём, быў сакратаром камітэта камсамола ў тэхнікуме, капітанам баскетбол ьнай каманды. Аднойчы ў Гомель з Саратава прыйшоў ліст: сённяшнія маладыя прасілі напісаць успаміны аб працы ў Саратаўскім аэраклубе.

- Звыш 50 гадоў мінула, шматлікае забылася, нямала і памятаецца... - згадваў Рыгор Кірылавіч,- У мяне захоўваецца дагэтуль сшытак, у якім запісаныя адзнакі за палёты курсанта Юрыя Гага-рына...

А праз пяць гадоў службы перспектыўнага авіятара прызначылі кіраўнікомі саратаўскага аэраклуба, у будынку якога ён разам з жонкай і пасяліўся ў 1954 годзе. Тады ж на курсы прыйшоў прасіцца 20-гадовы Юрый Гагарын. На фонедзецюкоў-дзесяцікласнікаў хлопец выглядаў гэтакім пераросткам. Зрэшты, на курсы яго нельга было залічыць па адной прычыне. На той момант за подпісам Мікалая Каманіна - тады ўжо кіраўніка саюзнага авіяцыйнага ведамства - выйшла распараджэнне: не набіраць у аэраклубы выпускнікоў асобных тэхнічных вучэбных устаноў. Прасцей кажучы, не перавабліваць гатовыя кадры. А Гагарын у той момант вучыўся ў саратаўскім індустрыяльным тэхнікуме на ліцейшчыка. Ніяк нельга было яго браць. Дзенісенка заўважыў: у хлопца вока гарыць на гэтую справу, і дазволіў часова на-ведваць тэарэтычныя курсы, а сам вырашыў пагаварыць з Каманіным.

Якраз трэба было ехаць на зборы ў Маскву. Гутарка скончылася ў карысць новага курсанта. Каманін пагадзіўся: заўсёды могуць быць выключэнні З правіл, толькі трэба атрымаць дабро ў саратаўскага ваенкамага і індустрыяльнага тэхнікума. Рыгор Кірылавіч прайшоўся па ўсіх інстанцыях, усюды заручыўшыся падтрымкай. Праўда, адну ўмову перад будучым курсантам усё-такі паставіў: «Скончыш тэхнікум з чырвоным дыпломам - быць табе лётчыкам, а калі няма -

пойдзеш працаваць сталяварам!»

Пазней Дзенісенка з усмешкай успамінаў свой ультыматум.

На першы погляд Гагарын пакідаў уражанне весялуна, душы кампаніі. Аднак ён апынуўся вельмі арганізаваным маладым чалавекам. Усюды паспяваў: шэсць гадзін заняткаў у тэхнікуме, чатыры гадзіны ў клубе, яшчэ спорт, грамадская нагрузка. Неяк Дзенісенка папрасіў Гагарына як ліцейшчыка вырабіць маленькія мадэлі самалётаў для правядзення тэарэтычных заняткаў. Той асабіста зрабіў некалькі штук, якія Дзенісенка захоўваў і потым. Пасля таго як ліцейшчык Гагарын паклаў на стол перад Дзенісенкам чырвоны дыплом аб заканчэнні тэхнікума, начальнік аэраклуба з чыстым сэрцам залічыў яго курсантам, дапусціўшы да палётаў у шостай групе. Юрый Гагарын, як і ўсе іншагароднія, пасяліўся на тэрыторыі клуба ў палатцы. Калі ў выхадныя дні кухары раз'язджаліся па хатах, Дзенісенка казаў Лідзіі Іванаўне: «Рыхтуй, жонка, вялікую каструлю баршчу і кашы, каб рабят накарміць».

Праз гады, гледзячы па тэлевізары на першага касманаўта, жонка Рыгора Кірылавіча нязменна пляскала рукамі: «Трэба ж, як выйшла, тэты хлопчык еў маё бацвінне!»

Апошні іспыт на самалёце Я к-18 у Гагары на прымаў Рыгор Дзенісенка і даў яму дабро на самастойныя палёты...

Убачыцца ж з касманаўтам Гагарыным яго настаўніку давялося толькі 18 мая 1963 года.

- Нас, начальнікаў аэраклубаў, штогод запрашалі ў Маскву на вучэбныя зборы.

18 мая 1963-га я прыехаў у сталіцу ў чарговы раз. Прама з Кіеўскага вакзала тэлефаную Мікалаю Пятровічу Каманіну: «Ужо два гады з Юрыем не магу сустрэцца, хацеў бы па-гутарыць з ім. Нават крыўдна, яго былы настаўнік, а ніяк не надарылася СУутпэча. .» Нм што Каманін мне з ходу і кажа: «Давай хутка да мяне. Юра тут будзе з хвіліны на хвіліну. Яго з Крыма выклікалі ў Маскву, каб па тэлебачанні павіншаваў дзятву з Днём піянерыі». Добра, што ў мяне быў з сабой фотаапарат. Толькі я зайшоў у кабінет, як следам з'явіўся Гагарын. Мы, вядома, абняліся, і я давай яго распытваць. Тады аб касмічных палётах у газетах не распавядалі - усё трымалася ў сакрэце. Юрась прызнаўся, што самым няўтульным было адчуванне, калі карабель уваходзіў у шчыльныя пласты атмасфе-ры. Здавалася, патрапіў пад зварачны апарат - такія іскры сыпаліся ад корпуса, і быццам скачаш па камянях. А самае незвычайнае відовішча, з.яго слоў, - касмічная вясёлка, якую зямнымі фарбамі паўтарыць проста немагчыма. Пакуль мы гутарылі, у кабінет зазірнуў Герман Цітоў. На фотаздымку так і выйшла: Герман Цітоў, я і Юрый Гагарын...



**«...Я ЛЮБЛЮ НАШ ГОМЕЛЬ!»**

19 красавіка 1956 года Рыгор Дзенісенка ўпершыню прыехаў у Гомель. Ускараскаўся на парашутную вышку ля вакзала... Праслаўлены лётчык-ас, які зрабіў у Вялікую Айчынную 197 баявых вылетаў, уганараваны званием Героя Савецкага Саюза, хто зведаў шмат гора і пакут, быў узрушаны тым, што ўбачыў.

- Горад ляжаў яшчэ ў развалінах. З вакзала да парка ўся тэрыторыя была як на далоні, - успамінаў Рыгор Кірылавіч. -А Сож так моцна разліўся, што, здавалася, нябёсы на зямлю паваліліся. Уся Якубоўка плавала...

Абраць Гомель месцам для далейшага мірнага жыцця яму параіў былы кампалка. А Рыгора Кірылавіча вабіла сюды яшчэ і таму, што літаральна ў сотні кіламетраў - зямля роднай Украіны.

Ужо праз пару дзён ён уладкаваўся ў аэраклуб, узляцеў на самалёце і ўбачыў, што насуперак усяму вясна набірае сілу: першая зелянiна травы, дрэвы ў алеях і скверах нібы прыглушаюць чарноцце каркасаў жылых хат і ўстаноў. А ў Залінейным раёне паступова набываюць свае каляровыя карункавыя накідкі ранння вішні.

- Тое, што засталося ад Гомеля, міжволі навявала сумныя думкі. Але

гараджане, у асноўным былыя франтавікі, жанчыны, упарта ўзяліся за ўзнаўленне кварталаў-разбіралі руіны, закладвалі падмуркі пад новыя дамы, - распавядаў ветэран. - Зараз, праз гады, шкадую, што не фатаграфаваў адраджэн-не горада, які стаў родным.

Дзенісенка працаваў метадыстам, потым начальнікам штаба мясцовага аэраклуба. Тут займаліся падрыхтоўкай будучых ваенных лётчыкаў. А колькі ў тыя гады расло ў Гомелі чэмпіёнаў рэспублікі, рэкардсменаў па парашутным і планерным спорце!

- Я цягніком у сваім пасляваенным жыцці практычна не ездзіў, - дзяліўся ветэран. -Асабліва прыемна было ляцець, калі за штурвалам грамадзянскага самалёта твой курсант, які дакладна паўтарае твас рухі, практычна тваімі рукамі кіруе самалётам. А для палётаў на планерах ідэальнае месца мы вызначылі для сябе над Палацам культуры завода «Гомсельмаш». Там заўсёды цёплыя паветраныя плыні, верагодна, ад металу.

У той час Дзенісенка быў у Гомельскай вобласці не адзіным Героем Савецкага Саюза. Але ён - лётчык, а гэтая прафесія на асаблівым рахунку. І Рыгор Кірылавіч пастаянна адчуваў душэўнае стаўленне да сябе і з боку кіраўніцтва, і ад радавых грамадзян. Узначальваў абласную ветэранскую арганізацыю, чатыры разы абіраўся дэпутатам райсавета, адзін раз - абласнога. Жыў на адной пляцоўцы з не мсней праслаўленым лётчыкам Паўлам Галаўнёвым, які ваяваў у небе Іспаніі.

- У авіяцыю ідуць добраахвотна, у адрозненне ад іншых радоў войск, - зазначаў мой герой. - Кожны палёт з яго перагрузкамі можна параўнаць з упартымі заняткамі спортам.

З ім Рыгор Кірылавіч сябраваў усё сваё жыццё. І калі працаваў начальнікам АТК у авіярамонтных майстэрнях, і пазней, калі ўладкаваўся на завод «Электра-апаратура». Пяць кіламетраў ад свайго дома да прадпрыемства першыя гады пераадольваў бегам, азатымамаль два дзесяцігоддзі хадзіў пешшу. Тэта было няўхільным правілам.

Не аднойчы Дзенісенку, які меў у сваім багажы 550 скачкоў з парашутам, спрабавалі перавабіць на працу ў Мінск, Маскву, іншыя гарады. А ён урос у Гомель, палюбіў яго як самае ўтульнае і жаданае месца на зямлі.

- Я надта люблю нашДЪмель! Жыву, можна сказаць, у сэрцы горада, - прызнаваўся ветэран.

- Бывала, яшчэ ў 60-я, калі не было маета праз Сож, лодачнікі за пяць капеек перавозілі жадаючых на левы бераг.

Часам заплюшчу вочы і ўяўляю горад, якісустрэў мяне ў 1956-м. Проста не верыцца, што ён паўстаў з руін. Сэрца радуецца, калі бачу новыя мікраараёны, будаўнічыя краны на пляцоўках. Хачу, каб маладыя шанавалі родны горад і надалей з поспехам адстойвалі гонар Гомеля на розных алімпіядах, спаборніцтвах, конкурсах...



**АПОШНІ ГЕРОЙ**

У 1988 годзе Рыгору Дзенісенку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гомеля», а праз 18 гадоў ён ўганараваны гэтым званием і ў маштабе вобласці. Варта заўважыць, што абодва арыпнальныя значкі з выявамі герба нашага горада і сцяга вобласці ветэран насіў нараўне са сваёй вышэйшай узнагародай - «Залатой зоркай» Героя Савецкага Саюза. Ён быў апошнім Героем Савецкага Саюза на Гомельшчыне. Яго так прыжыцці і звалі - «Апошні герой».

Нягледзячы на ўзрост, заспець Дзенісенку можна было толькі ў двух выпадках: калі ён ішоў раніцай на рэчку, альбо збіраўся на пешае падарожжа, ці знаходзіўся ў абласным савеце ветэранаў, дзс нязменна ўдзельнічаў ва ўсіх мерапрыемствах. Рухавы па натуры, ва ўсіх

сэнсах герой, ён усюды працаваў з поўнай аддачай сіл. Так кажуць, на грамадскай справе «гарэў». Пры гэтым разумение «грамадская праца» былы лётчык Дзенісенка ўспрымаў куды шырэй, чым патрабуецца.

Заслугі ветэрана не засталіся незаўважанымі. Некалькі гадоў таму палкоўнік у адстаўцы Рыгор Дзенісенка быў узнагароджаны ордэнам Пашаны - у ліку выбітных дыпламатаў, прадстаўнікоў прамысловасці, дзеячаў культуры, спартсменаў... Дарэчы, тэта была чацвёртая ўзнагарода, атрыманая ветэранам з рук Аляксандра Лукашэнкі. Тым не менш наш герой на гэтай сустрэчы ў Мінску хваляваўся, як у першы раз, - хоць і знаёмая ўжо працэдура, а звыкнуцца з ёй складана: не кожны дзень Прэзідэнт узнагароджвае.

Калі Аляксандр Лукашэнка прымацаваў ордэн да пінжака ветэрана, у адказ бадзёра пра-гучала: «Служу беларускаму народу!»

-У нашайрэспубліцызаўсёды прыходзілі да ўлады цудоўныя людзі, - выказвае сваё заха-пленне Рыгор Кірылавіч. - Яны разумеюць праблемы ветэранаў і падтрымліваюць нас. Нашай краінай кіруюць разумныя, дальнабачныя палітыкі. Яны ад зямлі, ад народа. І патрыятызм у іх глыбокі, не паказны.

Нядаўна я праехаў разам з іншымі ветэранамі па маршруце нафтаправода «Дружба». Палі - што сталы: роўненькія, дагледжаныя. Душа цешыцца. Правільна, што наш Прэзідэнт сумесна з урадам узяліся за сельскую гаспадарку, адраджэнне вёскі. Хлеб - усяму галава. І мы, ветэраны, ганарымся, што жывем у такой цудоўнай краіне. Вось я думаю: на вайне чалавек гінуў, ішоў на амбразуру, на верную смерць. Што, ён жыць не хацеў? Глупства. Але адыходзілі на задні план свае асабістыя клопаты, сваё жыццё дзеля выратавання краіны. Зараз нярэдка пачуеш папрокі, маўляў, выхаванне ў СССР было палітызавана. Каму тэта сапса-вала жыццё? Да прыкладу, усе нашы кіраўнікі прайшлі школу камсамола. Вуліца хіба лепшаму навучыць? Школа выхоўвала ў духу адданасці Радзіме. Гурткі, гульні разнастайныя, злёты. Няўжо тэта дрэнна? Мы адчуваем таксама да сябе павагу і добрае стаўленне з боку кіраўніцтва горада і вобласці, - дзяліўся мой суразмоўца. - Прыемна, што заслугі нашага пакалення не сыходзяць у цень. 3 намі раяцца па шматлікіх пытаннях, з намі лічацца высокія кіраўнікі дзяржавы...

Рыгор Кірылавіч жадаў усім жыхарам Беларусі добрага здароўя, поспехаў, каб абавязкова ўспаміналі тых людзей, хто адстаяў Вялікую Перамогу і сышоў з жыцця. А моладзі часцей зазіраць у лёсы сваіх блізкіх і родных, асэнсоўваць веліч Перамогі. Жыць без вайны, шчасліва, годна!

## МАРА ГЕРОЯ

А гэтыя радкі напісаны ў канцы 2010-га. Ніхто і надумаць яе мог, што хутка здарыцца бяда.

...У Рыгора Кірылавіча чатыры праўнукі, прычым трое з іх - хлапчукі, для якіх прадзед -скарбніца інфармацыі аб страшнай вайне. Затаіўшы дыханне, яны слухаюць успаміны аб паветраных баях з фашысцкімі лётчыкамі, захапляюцца прадзедам.

- Спадзяюся, што цяперашні пашпартяшчэзмяню 10 мая 2021 года. Тэта адна задача. Другая -ажаніць праўнука Зміцера, дачакацца ад яго прапраўнука. І тады я скажу: «Хлопцы! Мая місія выкананая, а цяпер справа за вамі». Спадзяюся пабіць рэкорд сястры бацькі, якая пражыла 97 гадоў. А яшчэ карціць... Вось я ўкраінец. Але другой маёй радзімай стала Беларусь. Тут я жыву ўжо звыш паўстагоддзя. Нявестка мая - беларуска, зяць - рускі. Так што ў маёй сям'і аб'яднаныя тры славянскія народы. Падзяліць нас немагчыма. Па жывым разрэзалі тры народы, якія ўсё жыццё былі разам. Цяпер і нам, ветэранам, вельмі складана мець зносіны з баявымі сябрамі. Мы ж ніколі не дзяліліся па нацыянальных прыкметах, адзіным палком змагаліся за нашу агульную Радзіму. Сэрца сваё на часткі не разарвеш, так што я лічу, што і нашым краінам трэба быць разам, як сёстрам у адной сям'і. Па-куль будзем жыць па-суседску, але, думаю, надыдзе час, калі ўсе тры славянскія народы ізноў аб'яднаюцца, у чым пераконва-юць гістарычныя прыклады.

Балела ветэрану за лёсы славян...